
РЭЧЫ І ГІСТОРЫІ
ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

ЭПІСТАЛЯРНАЯ СПАДЧЫНА МАКСІМА БАГДАНОВІЧА


Для письменнаго сообщенія.

Лева!

Папа болен ревматиз-
мом и писать настоящее
не может, а потому
я, чтобы бланк зря не
пропадал, но что
писать – и сам
не знаю. Заболел
папа сегодня
утром, т. о. ничего о степени
развития его болезни
неизвестно. Домашние
же дела – такая
мелочь и канитель, что
коли писать – пяти
писем не хватит,
а выделить что-
нибудь покрупнее –
никак не выделишь.
Поэтому, благополучно
добираясь до конца
бланка, спешу
поставить точку.

19 20/III 14 г.

Эпісталярый Максіма Багдановіча нешматлікі. У каталогу аўтографаў не набярэцца і 20 адзінак. Але як чалавек сваёй эпохі М. Багдановіч вёў вялікую перапіску.

Найбольшую цікавасць выклікаюць лісты, звязаныя з творчай працай паэта – ліставанне з рэдакцыямі і выдавецтвамі. Так, захаваліся допісы да супрацоўнікаў газет “Наша Ніва” і “Маладая Беларусь”. Лагічна меркаваць, што М. Багдановіч камунікаваў з выданнямі, у якіх былі размешчаны яго творы: “Bielarus”, “Дзянніца”, “Весник Европы”, “Украінская жизнь”, “Украінская хата”, “Сатирикон” і “Новый сатирикон”, “Жизнь для всех”, “Национальные проблемы”, “Нижегородский листок”, “Северная газета”, “Северные записки”, “Голос”, “Русский экскурсант”, “Заря” (Яраслаўль), “Музыка”, “Ежемесячный журнал литературы, науки и общественной жизни” (Пецярбург); аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Акадэміі навук (Петраград), выдавецтвамі “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Польза”, “Парус”, Беларускай кнігарняй. Застаецца толькі здагадвацца, каму Максім Адамавіч пісаў і дасылаў свае творы яшчэ, акрамя тых, дзе атрымаў адмову (“Голос минувшего”, “Нива”, “Русские записки”). Гэта дае надзею на новыя знаходкі. Так, у 2018 г. Дар’я Маскоўская выявіла рукапіс аўтаперакладаў паэта ў Інстытуце сусветнай літаратуры Расійскай акадэміі навук, у архіве «Товарищества “Знание”», якім апекаваўся Максім Горкі.

Згодна з крыху супярэчлівымі звесткамі Язэпа Дылы і Васіля Мачульскага, якія працавалі з архівам паэта ў 1920-я гг., у М. Багдановіча захоўваліся лісты ад: С. Палуяна (9), В. Ластоўскага (20), Я. Хлябцэвіча (4), Я. Купалы (2), Б. Эпімаха-Шыпілы (2), В. Лявіцкай (12), А. Бурбіса (7), Цёткі (1), Я. Манькоўскага (3), Р. Зямкевіча (1), А. Грыневіча (1), І. Бахонка (2). Сярод іх трапляліся і ўнікальныя, як ліст Алаізы Пашкевіч, адзіны на той час вядомы аўтограф пісьменніцы.

Перад Вялікай Айчыннай вайной даследчык Рыгор Жалязняк пісаў, што “имевшиеся в архиве Академии наук БССР письма Богдановича исчезли”. Шкада, з эпісталярыю захаваліся толькі паасобныя сказы, цытаваныя ў перадваенную пару беларускімі даследчыкамі. Цьмяны лёс лістоў Максіма Адамавіча пакідае прастору для пошукавай дзейнасці.

Перапісваўся М. Багдановіч і з дзеячамі рускай культуры. Захаваўся ліст да В. Брусава і да філолага Ф. Карша. Верагодна, была перапіска з маскоўскімі лінгвістамі-фальклярыстамі братамі Сакаловымі, Елеонскай, Багатыровым; членамі сям’і Дунаевых, дзе Максім даваў урокі для дзяцей.

З ліставання са сваякамі і прыяцелямі, калегамі па працы і вучобе можна даведацца багата дэталяў пра класіка. Але большасць мы маем у выглядзе цытат і пераказаных урыўкаў: ад М. Агурцова – 2, М. Ашукіна – 4, А. Багдановіча – 9, У. Белавусава – 5, Д. Дзябольскага – 4, А. Кабанава, П. Гапановіча, Г. Гапановіч, А. Залатарова, Л. Сівіцкай, К. Салтыковай (?), В. Осіпавай да загадкавых *М. А. Киц-най*, *К. П.* і *К. И. Л.*

Зразумела, што гэтае кола было значна шырэйшым. І менавіта ў лістах да самых блізкіх паэт дазваляў сабе быць разняволеным, абаяльным і вясёлым:

Лева!

Папа болен ревматизмом и писать настоящее не может, а потому пишу я, чтобы бланк зря не пропадал, но что писать – и сам не знаю. Заболел папа сегодня утром, т. о. ничего о степени развития его болезни неизвестно. Домашние же дела – такая мелочь и канитель, что коли писать – пяти писем не хватит, а выделить что-нибудь покрупнее – никак не выделишь. Поэтому, благополучно добираясь до конца бланка, спешу поставить точку.

19 20/III 14 г.

Арыгінал захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

Міхась БАРАНОЎСКІ,
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.